А. А. Бяляй, Я. І. Фралоў

# ПАЗАШЛЮБНАЕ ЖЫЦЦЁ ШЛЯХТЫ ВКЛ

*Разглядаюцца маладаследаваныя моманты пазашлюбнага боку жыцця шляхты ВКЛ.*

Грамадства ВКЛ мела свае погляды на натуральныя і ненатуральныя сексуальныя адносіны, а таксама на дазволеныя і забароненыя. У многім забарона на тыя ці іншыя стасункі сыходзіла са стаўлення да гэтай сферы рэлігіі, якая адносіла іх да грахоўных. Найбольш асуджаліся жыццё ў нявенчаным шлюбе, дашлюбныя дачыненні, стасункі паміж сваякамі, пералюб, бігамія, гомасексуалізм, заафілія, секс праз гвалт і прастытуцыя. Немагчыма сцвярджаць, што сексуальныя стасункі шляхты ВКЛ былі толькі у шлюбе. Але пра пазашлюбныя стасункі адкрыта не гаварылася. У асноўным гэта адлюстроўвалася ў эратычнай літаратуры. Паколькі аўтарамі твораў былі мужчыны, то і праблематыка перадавалася з іх пункту гледжання, з чаго вынікала, што для мужчыны было важным задавальненне сексуальных патрэбаў у сям'і альбо за яе межамі. Жаночы погляд на сексуальную сферу з'явіўся толькі ў XVIII ст. Адсутнасць задавальнення ў шлюбе ці фізіялагічныя патрэбы штурхалі шукаць сувязі ў іншых месцах. Магчымасцей для пазашлюбных стасункаў было шмат: прыслуга, самотныя асобы, удовы і інш. Падарожжы таксама выкарыстоўвалі не толькі для вывучэння замежных моў і заняткаў ва ўніверсітэтах. Канюшы ВКЛ Багуслаў Радзівіл (1620-1669) быў добра абазнаны ў парыжскім жыцці. Ён суправаджаў маладога Яна Замойскага па не зусім свецкіх раёнах Парыжа, дзе той атрымаў першыя эратычныя поспехі і паразы. Пошукі сексуальных прыгод былі актуальныя для вайскоўцаў. К 1557 г. у пастановах для войска Жыгімонта Аўгуста было забаронена вазіць з сабой "вясёлых паненак". Толькі жонкі мелі права суправаджаць сужэнцаў у вайсковых паходах. Жанчыны неадпаведных паводзін не павінныя былі прысутнічаць у войску. Вайсковыя артыкулы выконваліся. У ваенных артыкулах за 1609 г. на ротмістраў ускладаліся абавязкі сачыць, каб не было прастытутак у войску. Далёка не ўсе жонкі выпраўляліся ў паход. Для сексуальнага задавальнення вайскоўцы карысталіся не толькі паслугамі прастытутак, але і гвалтавалі мясцовых дзяўчат і жанчын. Шлюбныя здрады мелі месца сярод мужчын і жанчын. Яны сведчылі пра жаданне знайсці задавальненне па-за межамі сям'і. Так, Зафея Радзівілаўна (? – 1614) здрадзіла мужу Крыштафу Мікалаю Дарагастайскаму (1562 - 1615), маршалу ВКЛ, па прычыне яго доўгай адсутнасці ў доме і таму, што "купідон не раскрываў яму вароты перад страсцю". Каханкам быў слуга Станіслаў Тымінскі. Тарэза Гасеўская (? – 1708), з'яўляючыся жонкай Юзафа Багуслава Служкі, мела стасункі з гетманам ВКЛ Казімірам Янам Сапегам. Пасля смерці мужа выйшла замуж за Сапегу ў 1703 годзе. Такім чынам, наяўнасць сведчанняў пра пазашлюбныя стасункі шляхты ВКЛ не азначае, што тагачаснае грамадства было амаральным. Пазашлюбныя стасункі шляхты ВКЛ падлягалі пэўнай рэгламентацыі на падставе заканадаўства, кананічнага права, традыцый і звычаяў.

### *Спіс літаратуры*

1. Сліж, Н. Шлюбныя і пазашлюбныя стасункі шляхты ВКЛ у XVI -XVII стст./Н. Сліж. - Смаленск: Інбелкульт, 2015. - 672 с.

*Бяляй Андрэй Аляксеевіч*, студэнт 1 курса факультэта інфармацыйных тэхналогій і кіравання Беларускага дзяржайнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі, jasper45663@gmail.com.
*Фралоў Яраслаў Ільіч*, студэнт 1 курса факультэта інфармацыйных тэхналогій і кіравання Беларускага дзяржайнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі, Iarosiav$_{f}$*rolov@mail.ru.*
*Навуковы кіраўнік: Мікалаева Людміла Віктараўна*, загадчык кафедры гуманітарных дысцыплін Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, Mikalayeva@bsuir.by.